## Што рабіць, калі вас затрымала міліцыя?

*(Парады ад юрыстаў Праваабарончага Цэнтру "Вясна", www.spring96.org/be/book)*

Першае, што трэба ведаць пры адміністратыўным затрыманні, - гэта тое, што паводле арт. 8.4 Працэсульна-выканаўчага кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях (далей - ПВКаАП) адміністратыўнае затрыманне фізычнай асобы можа працягвацца **не больш за тры гадзіны.**

На тэрмін больш за тры гадзіны, **але не больш за 72 гадзіны,** могуць быць затрыманыя асобы, якія здзейснілі адміністратыўнае правапарушэнне, за якое ў якасці спагнання прадугледжаныя адміністратыўны арышт ці дэпартацыя. Тэрмін адміністратыўнага затрымання пачынаецца **з моманту фактычнага затрымання.** У выпадку затрымання на тэрмін, большы за тры гадзіны, паводле п. 4 арт. 8.4, затрыманне павінна афармляцца пратаколам.

Паводле арт. 8.5, пратакол пра адміністратыўнае затрыманне абвяшчаецца затрыманаму. Пры гэтым затрыманаму павінна быць растлумачана яго права запрасіць адваката (паводле п.5 ч.1 арт. 4.1 ПВКаАП).

На просьбу затрыманага на працягу трох гадзін прадстаўнікі органаў, якія ажыццяўлялі затрыманне, павінны паведаміць пра месца знаходжання затрыманага яго паўнагадовым членам сям'і, блізкім сваякам ці адвакату. Пра затрыманне непаўнагадовых тыя, хто затрымліваў, **абавязкова** павінны паведаміць бацькам ці асобам, якія іх замяняюць.**Патрабуйце, каб пра ваша месцазнаходжанне паведамілі вашым родным.**

Пры правядзенні асабістага вобшуку памятайце, што яно павінна адбывацца ў прысутнасці панятых. Пры такім вобшуку павінны складацца пратакол альбо рабіцца адпаведны запіс у пратаколе аб адміністратыўным правапарушэнні ці затрыманні. Пры канфіскацыі рэчаў таксама патрабуйце складання пратаколу альбо адпаведнага запісу ў пратаколе пра адміністратыўнае правапарушэнне ці затрыманне, дзе былі б пералічаныя забраныя рэчы.

Пасля адміністратыўнага затрымання і дастаўкі ў памяшканне РУУС пачынаецца адміністратыўны працэс. Пачынаецца ён са складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.

Падчас складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне вас мусяць азнаёміць з вашымі правамі, пра што ў пратакол заносіцца адпаведная адзнака.

Паводле арт. 4.1 ПВКаАП, асоба, у дачыненні да якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае наступныя правы:

- ведаць, здзяйсненне якога адміністратыўнага правапарушэння ёй ставіцца ў віну;
- даваць тлумачэнні ці адмовіцца ад давання тлумачэнняў;
- прадстаўляць доказы;
- заяўляць адводы і хадайніцтвы;
- мець абаронцу (адваката) ад пачатку адміністратыўнага працэсу, а ў выпадку адміністратыўнага затрымання - ад моманту абвяшчэння ёй пра адміністратыўнае затрыманне;
- бесперашкодна размаўляць са сваім абаронцам (адвакатам) сам-насам і канфідэцыйна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы, адмовіцца ад абаронцы, бараніць сябе самастойна;
- карыстацца роднай мовай ці мовай, якой яна валодае, альбо паслугамі перакладчыка;
- пярэчыць супраць дзеянняў суддзі, асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, і патрабаваць унясення сваіх пярэчанняў у пратакол пра адміністратыўнае правапарушэнне ці ў пратакол працэсуальнага дзеяння;

- знаёміцца з пратаколам пра адміністратыўнае правапарушэнне, а таксама з матэрыяламі справы пра адміністратыўнае правапарушэнне пасля заканчэння падтрыхтоўкі яе да разгляду;
- удзельнічаць у разглядзе справы пра адміністратыўнае правапарушэнне;
- атрымліваць ад суду ці органу, які вядзе адміністратыўны працэс, копію пастановы пра накладанне адміністратыўнага спагнання;
- падаваць скаргі на дзеянні суддзі, службовай асобы, якая вядзе адміністратыўны працэс, у тым ліку абскарджваць пастанову пра адміністратыўнае правапарушэнне.

Ад моманту вашага затрымання і складання пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне вы маеце права заяўляць хадайніцтвы.

1. Такім чынам, **першым вашым хадайніцтвам павінна быць хадайніцтва пра абаронцу (адваката).** Паводле арт. 2.3. ПВКаАП суд ці орган, які вядзе адміністратыўны працэс, абавязаны забяспечыць абарону правоў, свабодаў і законных інтарэсаў удзельнікаў адміністратыўнага працэсу, стварыць устаноўленыя дзейным Кодэксам умовы для іх ажыццяўлення, своечасова прымаць меры па задавальненні іхных законных патрабаванняў. **Такім чынам, вашае права на абарону, гарантаванае арт. 62 Канстытуцыі РБ, павінна быць забяспечанае.**

2. Калі вы маеце намер даваць тлумачэнні па справе — памятайце, што ўсе вашыя тлумачэнні мусяць быць дакладна адлюстраваныя **ў пратаколе апытання, які пасля заканчэння апытання мусіць быць прадстаўлены вам для прачытання.** Вы маеце права патрабаваць унясення ў гэты пратакол сваіх правак і дапаўненняў. Яны падлягаюць абавязковаму ўнясенню ў пратакол. Свае тлумачэнні вы можаце выкласці асабіста ў пісьмовым выглядзе. Калі вы мяркуеце, што па справе неабходна апытаць сведкаў, вы можаце заявіць пра гэта адпаведнае хадайніцтва (лепей пісьмова).

3. Пасля заканчэння падрыхтоўкі матэрыялаў адміністратыўнай справы вы маеце права азнаёміцца з усімі матэрыяламі. **Памятайце, што вам мусяць выдаць копію пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.** Такім чынам, памятайце, што вас мусяць азнаёміць з усімі матэрыяламі справы (пратаколамі адміністратыўнага затрымання, пратаколам апытання, іншымі пісьмовымі матэрыяламі справы), азнаёміць і выдаць на рукі копію пратаколу пра адміністратыўнае правапарушэнне.

4. Пастанову пра адміністрацыйнае правапарушэнне і накладзенае адміністратыўнае спагнанне вы маеце права абскардзіць у вышэйстаячы суд ці ў пракуратуру. Падача скаргі ў дзесяцідзённы тэрмін прыпыняе выкананне пастановы (за выключэннем адміністратыўнага арышту і дэпартацыі, якія выконваюцца неадкладна ад моманту вынясення пастановы) да разгляду скаргі вышэйстаячым судом. Таксама вы маеце права абскардзіць у органы пракуратуры і суд любыя незаконныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі.

## Некалькі дадатковых парадаў у выпадку затрымання (Ад Андрэя Бастунца)

Рызыка адміністратыўнага затрымання заўсёды суправаджае журналіста ў яго прафесійнай дзейнасці. Вы павінны памятаць некалькі рэчаў.

Затрыманне мусіць мець пад сабой прававыя падставы – а менавіта здзяйсненне правапарушэння. Падставы для арышту міліцыянты заўсёды могуць калі не знайсці, дык прыдумаць.

***ВАЖНА:*** *З моманту, калі вам абвесцілі пра ваша затрыманне, вы маеце права на адваката, можаце яго патрабаваць і адмаўляцца без яго прысутнасці ад удзелу ў нейкіх дзеяннях.*

Адзіная праблема: са “сваім” адвакатам мусіць быць папярэдне заключана пагадненне (гл. вышэй) – у адваротным выпадку яго давядзецца заключаць вашым блізкім сваякам. Але ж вы можаце настойваць на праве мець адваката і без такой дамовы. У шэрагу выпадкаў гэта прымушае міліцыю вызваліць затрыманага для заключэння пагаднення з абаронцам.

Спасылайцеся на арт. 4.1. Працэсуальна-выканаўчага кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях. Ён вызначае, што *“фізічная асоба, у дачыненні якой вядзецца адміністратыўны працэс, мае права:... **мець абаронцу** з моманту пачатку адміністратыўнага працэсу, а ў выпадку адміністратыўнага затрымання – з моманту аб’яўлення ёй аб адміністратыўным затрыманні”.*

Тэрмін затрымання без афармлення пратаколам, як ужо згадвалася, не можа доўжыцца больш за тры гадзіны. Права на абаронцу абвяшчаецца затрыманаму падчас складання пратаколу аб затрыманні. Але затрыманы можа патрабаваць яго ўжо з моманту затрымання.

Журналісту могуць сказаць, што ён не затрыманы, а дастаўлены ў пастарунак для высвятлення асобы. У гэткіх выпадках трэба адказаць, што неабходныя дакументы, якія пацвярджаюць асобу (самы “моцны” – пашпарт) прад’яўленыя, пасля чаго запатрабаваць вяртання пашпарту і сыходзіць. Калі не атрымліваецца – патрабаваць кнігу заўваг і прапаноў, настойваць на выкліку свайго прадстаўніка (у тым ліку адваката).

Заканадаўства дазваляе выманне рэчаў у затрыманага. Патрабуйце складання адпаведнага пратаколу і ўважліва сачыце за тым, каб у яго былі ўнесеныя ўсе тыя рэчы, якія ў вас адабралі.

## *Фатаграфаванне затрыманых, правядзенне дактыласкапіі, ужыванне сілы*

ПВКаАП дазваляе фота-відэаздымкі затрыманых і іх дактыласкапію. Але гаворка ідзе менавіта аб **затрыманых** (а не аб тых, каго даставілі для высвятлення асобы), і толькі ў вызначаных кодэксам выпадках.

Закон дазваляе фатаграфаванне, кіна- і відэаздымкі асобаў, у дачыненні да якіх вядзецца адміністратыўны працэс, ці асобаў, якія падпалі пад адміністратыўны арышт. Спробы паставіць вас на фота- ці відэаўлік сведчаць пра тое, што адміністратыўны працэс супраць вас ужо распачалі, і вы маеце права ведаць, у чым вас абвінавачваюць, патрабаваць адваката і адмаўляцца да яго прыбыцця ад якіх-кольвек дзеянняў.

У заканадаўства аб дактыласкапіі ўнесеныя змены. Але тое, што яна стала абавязковай для ваеннаабавязаных, не значыць, што яе могуць патрабаваць ад кожнага ваеннаабавязанага падчас адміністратыўнага затрымання. Міліцыя – не ваенкамат. Згодна з КаАП, затрыманага могуць прыцягнуць да абавязковай дактыласкапіі толькі ў выпадку, калі за здзейсненае ім правапарушэнне **прадугледжваецца адказнасць у выглядзе адміністратыўнага арышту.**

І залішне казаць, што ўжыванне фізічнай сілы супрацоўнікамі міліцыі дазваляецца толькі ў выключных выпадках.

Супрацоўнік органаў унутраных спраў мае законнае права ўжыць фізічную сілу для:

- спынення адміністратыўных правапарушэнняў,
- затрымання асобаў, якія іх здзейснілі,
- самаабароны,
- пераадолення супрацьдзеяння сваім законным патрабаванням толькі ў тых выпадках, калі негвалтоўным чынам гэтага зрабіць немагчыма.

Усё.

Калі вашы правы ў міліцэйскім пастарунку парушаныя, вы можаце абскардзіць дзеянні міліцыянтаў вышэйшай службовай асобе ці ў вышэйшы орган, у пракуратуру альбо суд.

### *Калі вы парушылі закон*

Магчыма, вы сапраўды парушылі закон. Не ўсе ведаюць, што, калі чалавек здзейсніў адміністратыўнае правапарушэнне і адразу прызнаў сваю віну, пазначыў у пратаколе, што згодны на прымяненне да яго адміністратыўнага спагнання, то ён можа атрымаць мінімальнае пакаранне.

***ВАЖНА:*** *Калі грамадзянін прызнае сябе вінаватым і дае згоду ўжыць да яго адміністратыўнае спагнанне, яму даюць найменшы штраф, прадугледжаны за здзейсненае правапарушэнне, а калі найніжэйшая мяжа не вызначаная, дык не больш за палову базавай велічыні, на сёння – 17 тысяч 500 беларускіх рублёў.*

*Адзінае, што трэба мець на ўвазе, - правілы памяншэння штрафу за адміністратыўнае правапарушэнне не дзейнічаюць, калі артыкул КаАП прадугледжвае такія дадатковыя санкцыі, як пазбаўленне спецыяльнага права, пазбаўленне права займацца вызначанай дзейнасцю ці канфіскацыю; калі прадпрымальнік прыцягваецца да адказнасці ў сувязі з прадпрымальніцкай дзейнасцю і калі паўторнае адміністратыўнае правапарушэнне цягне за сабой крымінальную адказнасць.*

*Яшчэ раз заўважу, што прызнанне сваёй віны і згода на ўплату штрафа мусіць быць пазначаныя ў пратаколе аб адміністратыўным правапарушэнні.*

Але ж калі вы нічога не парушалі, бараніце свае правы з дапамогай адваката, вашых прадстаўнікоў з грамадскага аб’яднання, праваабаронцаў, сведкаў. І, зразумела, абскарджвайце дзеянні міліцыі вышэйшай службовай асобе ў пракуратуру ці ў суд.